## ГІСТОРЫЯ І БЕЛАРУСАЗНАЎСТВА

**С. Я. Новікаў**

# 20 ГАДОЎ ПАСЛЯ: НОВАЕ ПРАЧЫТАННЕ ДАКУМЕНТАЎ КАЛЕКЦЫІ «АЛЕКСАНДРЫЙСКІЯ МІКРАФІЛЬМЫ»

Нагадаем зацікаўленаму чытачу галоўную прычыну нашага звароту да калекцыі «Александрыйскія мікрафільмы». Яна ўзнікла ў аўтара гэтых радкоў у выніку таго, што роўна праз два дзесяцігоддзі пасля публікацыі артыкула, які выйшаў у другім нумары часопіса «Вести Института современных знаний» за 2000 год, даследчык палічыў неабходным зноў звярнуцца да «новай архіўнай першакрыніцы па ваеннай гісторыі Беларусі». Насамрэч, у якой ступені яе матэрыялы на бягучы момант з'яўляюцца для беларускіх гісторыкаў такой перашакрыніцай? Менавіта гэты акцэнт быў зроблены ў той час, калі айчынны чытач фактычна ўпершыню знаёміўся з трафейнымі мікрафільмамі ці проста «александрыйскай плёнкай», вядомай таксама з сучаснай германскай гістарыяграфіі пад назвай «патсдамская плёнка». Як адзначалася ў артыкуле, у тагачаснай айчыннай гістарыяграфіі не існавала навуковых распрацовак па згаданай тэме.

Не з'явіліся яны і пасля нашай публікацыі. Больш таго, як паказвае сучасная беларуская гістарыяграфія, «александрыйскія мікрафільмы» пакуль яшчэ не сталі прадметам спецыяльнага навуковага даследавання. Гэта выснова становіцца відавочнай у святле доктарскай дысертацыі У. В. Здановіча «Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны (1941–1945 гг.) у адлюстраванні айчыннай гістарыяграфіі», паспяхова абароненай у Інстытуце гісторыі НАН Беларусі ў 2016 г. Узнікае прынцыповае пытанне, чаму на працягу двух дзесяцігоддзяў беларускія гісторыкі на паставілі задачы па ўсебаковым вывучэнні матэрыялаў гэтай дакументальнай крыніцы па ваеннай гісторыі Беларусі. На наш погляд, адным з адказаў можа быць той факт, што ў сучаснай беларускай ваеннай гістарыяграфіі няма гісторыка, які б займаўся даследаваннем пытанняў гісторыі Беларусі ў гады германскай акупацыі 1941–1944 гг. з выкарыстаннем малавядомых нямецкіх крыніц, паколькі ўсе матэрыялы прадстаўляюць сабой калекцыю з трафейных дакументаў германскага вермахта, выяўленых саюзнымі войскамі, галоўным чынам падраздзяленнямі арміі ЗША, у розных установах на заключным этапе вайны. Сярод не менш цікавых для гісторыкаў застаецца пытанне аб паходжанні гэтых плёнак у фондах Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, дзе яны захоўваюцца і па цяперашні час. Выказаную намі гіпотэзу ў дачыненні да гэтага ніхто не аспрэчыў за мінулыя 20 гадоў. Але даследчыкаў у значна большай ступені павінен хваляваць тэрмін фізічнага захавання плёнак, паколькі па меры аддалення ад моманту іх стварэння ідзе працэс страты якасці кадраў, якія рабіліся ў сярэдзіне 1950-х гадоў, прычым у двух розных варыянтах – пазітыўным і негатыўным. Калі ў першым выпадку практычна не ўзнікае

праблем пры прачытанні сфатаграфаваных матэрыялаў на плёнках, дык у другім час зрабіў сваю справу, значна знізіў кантраснасць чытання дакументаў.

Нагадаем чытачу, што ў якасці «александрыйскіх мікрафільмаў», ці «патсдамскіх плёнак», аўтарам разглядаюцца мікракопіі нямецкіх трафейных дакументаў, арыгіналы якіх пасля вайны апынуліся ў ЗША і зберагаліся ў прыгараднай бібліятэцы г. Александрыя блізу Вашынгтона да пачатку 1960-х гадоў. З моманту дастаўкі трафейных дакументаў у Александрыйскую бібліятэку там была распачатая іх навуковая апрацоўка, тэматычная сістэматызацыя, сервісная падрыхтоўка, што можна абагульніць адзінай назвай як фарміраванне калекцыі «александрыйскіх мікрафільмаў». Цягам некалькі гадоў гэтым займаліся розныя дзяржаўныя ўстановы, у тым ліку: Амерыканскі камітэт па вывучэнні дакументаў Другой сусветнай вайны, Нацыянальны архіў, Цэнтр архіўнага сэрвісу. Але галоўную ролю ў стварэнні калекцыі адыграла Амерыканская асацыяцыя гісторыкаў, куды ўваходзілі ваенныя гісторыкі, архівісты, бібліятэкары, а таксама тыя, каму перад вайной ўдалося ўратавацца ад нацысцкага пераследу і пакінуць Германію. Як вынік, была распрацаваная структура кампаноўкі мікрафільмаў, прыняты агульныя формы тэхнічнай, архіўнай і навуковай апрацоўкі, уліку і інш.

Звернем увагу таксама на той факт, што служба архіўнага сэрвісу бачыла сваю галоўную задачу ў тыражаванні арыгінальных нямецкіх дакументаў, здымаючы іх на мікрафільмы. У тэхнічным плане некаторыя з іх мелі даўжыню больш за 25 метраў і налічвалі звыш за 1000 кадраў ці сфатаграфаваных старонак дакументаў. Па нашых падліках, на цяперашні час у Нацыянальнай калекцыі «Александрыйскія мікрафільмы» налічваецца 292 адзінкі захавання, на якіх размешчана звыш за 314 тыс. уліковых старонак дакументаў. Заўважым, што камплектаванне гэтай калекцыі спачатку вялося ў архіўным фондзе Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ, які ў пачатку 1990-х гадоў увайшоў у склад фондаў Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь. З уліковых звестак на сёння вядома, што айчыннаму даследчыку сталі даступнымі толькі крыху за 5 % матэрыялаў з гэтай калекцыі.

Да неабходнасці новага прачытання матэрыялаў калекцыі аўтара прымушае той факт, што пры першым знаёмстве з ёй два дзесяцігоддзі таму не ставілася задачы па паглыбленым вывучэнні саміх матэрыялаў. Тады галоўным бачылася толькі выяўленне малавядомага археаграфічнага патэнцыялу дакументальных матэрыялаў, іх агульнай характарыстыкі як «новай архіўнай першакрыніцы па ваеннай гісторыі Беларусі». На бягучы момант з'явілася патрэба ў крыніцазнаўчым аналізе нямецкіх матэрыялаў, захаваных сярод калекцыі “Александрыйскія мікрафільмы”. Разгледзім гэта толькі на адным з прыкладаў, датычных данясенняў аддзела выведкі і контрвыведкі штаба 9-й нямецкай палявой арміі. Аснову данясенняў складаюць розныя звесткі, галоўным чынам атрыманыя ў ходзе допытаў савецкіх ваеннапалонных і перабежчыкаў. У выніку можна вылучыць наступныя пазіцыі, звязаныя з: 1) баявымі часцямі (іх баяздольнасць, баявая моц, склад,

узбраенні, страты); 2) напаўненнем (адукацыя, узрост, нацыянальнае паходжанне); 3) выкарыстаннем на вайсковай службе жанчын; 4) санітарным станам і ўмовамі гігіены; 5) газавай вайной; 6) савецкімі ўзбраеннямі і тэхнічным забеспячэннем; 7) уздзеяннем нямецкай зброі; 8) настроем у савецкіх вайсковых падраздзяленнях; 9) настроем і становішчам у тыле; 10) прапагандай і абслугоўваннем часцей; 11) падставамі для пераходу да немцаў; 12) умовамі харчавання і забеспячэння; 13) транспартам; 14) эканомікай і прамысловасцю; 15) абыходжаннем з нямецкімі ваенна-палоннымі; 16) рознымі пытаннямі; 17) нумарам палявой пошты.

Возьмем адно з такіх данясенняў, № 6 ад 4 лютага 1944 г., у якім прыводзяцца звесткі пра 63 чырвонаармейца, якія загінулі падчас баёў у ходзе вызвалення Беларусі за першы месяц новага 1944 года. У дачыненні да вайсковых званняў і пасад, якія яны займалі: 11 – маёры, 1 старшы лейтэнант, 5 лейтэнантаў, 6 малодшых лейтэнантаў, 1 старшына, 1 старшы сяржант, 2 сяржанты, 1 малодшы сяржант, 34 радавыя і 11 грамадзянскіх асоб; з 63 чалавек 32 былі рускімі, 7 – украінцамі, 4 – беларусамі, усяго 69 % славян і 31 % іншых прадстаўнікоў, у тым ліку: 1 – чуваш, 3 – азербайджанцы, 6 – узбекаў, 1 – кіргіз, 1 – трукмен, 3 – таджыкі, 5 – казахаў. З вышэйшай адукацыяй не было нікога, ад 7 да 10 класаў навучання ў школе – 19 чалавек, ад 5 да 6 – 11, 4-класная адукацыя – 8, ад 1 да 3 класы – 12, неадукаваныя – 13. Па ўзросце: з 1926 г. – нікога, з 1925 – 4, 1924 – 6, з 1914 па 1923 – 20, з 1904 па 1913 – 24, 1893 па 1903 г. – 9. Па партыйнай прыналежнасці: члены партыі – 3, кандыдаты – 5, камсамольцы – 6, беспартыйныя – 49; сацыяльнае паходжанне: з сялян – 31, з рабочых – 23, служачых – 9. Прыналежнасць да вайсковых часцей: 5 чалавек – 33-й стралковай дывізіі, 5 чалавек – 60-й, 4 чалавекі – 137-й, 6 чалавек – 307-й, 6 чалавек – 399-й, па адным ці 2 чалавекі з розных часцей – 37 чалавек.

Такім чынам, аналіз нават аднаго з нямецкіх данясенняў дазваляе не толькі значна пашырыць уяўленні пра малавядомую дакументальную базу, але і атрымаць важныя звесткі для больш глыбокага вывучэння асобных старонак гісторыі першапачатковага вызвалення Беларусі. Уведзены матэрыял актуалізуе пытанне аб неабходнасці пастаноўкі на парадак дня сучаснай беларускай гістарыяграфіі адну з актуальных задач па крытычным аналізе падзей мінулага з мэтай максімальна поўнай рэканструкцыі гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны. У пераліку такіх задач павінна стаяць праца па ўвядзенні ў шырокі ўжытак малавядомых гістарычныя фактаў, без якіх на цяперашні час ужо немагчыма правядзенне ўсебаковага даследавання па згаданай праблематыцы. Відавочна, што фарміраванне новага інфармацыйнага кантэнту патрабуе не толькі ўвядзенне малавядомых нямецкіх крыніц, але і выкарыстанне метаду кампаратыўнага аналізу для далейшага аб'ектыўнага навуковага даследавання ваеннай мінуўшчыны.

Аналіз нават некаторых эмпірычных фактаў, выяўленых аўтарам гэтых радкоў сярод матэрыялаў калекцыі «Александрыйскія мікрафільмы», сведчыць аб невычэрпнасці крыніцазнаўчага патэнцыялу, які захоўваюць

арыгінальныя нямецкія дакументы, пакуль не ў дастатковай меры выкарыстаныя беларускімі і замежнымі даследчыкамі для ўсебаковага вывучэння гісторыі вызвалення Беларусі ўвосень 1943 – пачатку 1944 г.

**А. Г. Цымбал**

## ГІСТАРЫЧНАЯ ПАЛІТЫКА: ПАНЯЦЦЕ І ІНСТЫТУТЫ

Гістарычная палітыка, ці палітыка памяці, з’яўляецца адносна новым полем міждысцыплінарных даследаванняў, канэптуалізацыя паняційнага апарату якога і сёння не з’яўляецца канчаткова аформленай. Праблематыка гістарычнай палітыкі ляжыць у рэчышчы даследванняў калектыўнай памяці (memory studies), якая перажывае трэцюю хвалю ў сваім развіцці. У той жа час памяць даўно выйшла за межы выключна акадэмічных даследаванняў і стала полем, нагодай і сродкам шматлікіх канфліктаў паміж рознымі групамі ўнутры дзяржаў, а таксамі на міжнароднай арэне.

Абагульняючы значнасць феномена гістарычнай памяці, В. Ю. Малінава вылучае некалькі асноўных сфер, дзе яна знаходзіць праяўленне: 1) фарміраванне і падтрымка ідэнтычнаці групы; 2) легітымізацыя палітычных рашэнняў; 3) фактар палітычнай культуры; 4) элемент анталагічнай бяспекі; 5) фактар прыняцця знешнепалітычных рашэнняў; 6) элемент “мяккай сілы” ў знешняй палітыцы.

Удакладнення патрабуе паняційны апарат прадмета даследвання і суадносін паняццяў “гістарычная палітыка”, “палітыка памяці”. Украінскі даследчык праблем палітычнага выкарыстання гісторыі Г. Касьянаў адрознівае гэтыя два паняцці. На яго думку, гістарычная палітыка як адзін з відаў палітыкі накіравана на канструяванне і інструменталізацыю “гістарычнай памяці” і яе рэпрэзентацый, асабліва прафесійнай гістарыяграфіі. Як і любая сфера палітыкі, гістарычная палітыка з’яўляецца полем супрацьстаяння груп у барацьбе за ўладу і яе ўтрыманне. Гістарычная палітыка служыць сродкам забеспячэння форм лаяльнасці вялікіх грамадскіх груп і ўтрымання ідэалагічнага і палітычнага кантролю над імі. Утылітарнае выкарыстанне гісторыі і памяці з’яўляецца галоўнай рысай гістарычнай палітыкі, што знаходзіць праяву ў палітычных, заканадаўчых практыках унутранай і знешняй палітыкі.

Палітыка памяці, такім чынам, выступае больш вузкім тэрмінам, які ахоплівае практыкі, звязаныя з фарміраваннем калектыўнай ці гістарычнай памяці, і не прадугледжвае ўмяшання ў сферу прафесійнага гістарыяпісання ці дыдактыкі гісторыі

Па-іншаму да вызначэння суадносін гэтых паняццяў падыходзіць расійскі калектыў даследчыкаў з Цэнтра вывучэння калектыўнай памяці і сімвалічнай палітыкі пад навуковым кіраўніцтвам А. Міллера, якія разглядаюць дадзены феномен як элемент сімвалічнай палітыкі, пад якой разумеецца публічная дзейнасць, звязаная з вытворчасцю розных спосабаў